інфармацыі ад дзяржаўных устаноў, выконваецца не заўсёды.

Усе недахопы, пералічаныя вышэй, пацверджаны ў кнізе "Клады Беларусі ..." выразнымі фактамі. Звернемся да некаторых з іх.

У парадку эксперымента І. І.Сінчук здаў пад распіску ў прыёмную Міністэрства культуры РБ клад манет XVII стагоддзя. У выніку атрымалася наступнае: абумоўленае законам узнагароджанне, якое павінна выдавацца за выяўленне і пастаноўку на ўлік новага помніка гісторыі культуры, не выплачана, хоць ведамственнай інструкцыяй вызначаны дзесяцідзённы тэрмін выплаты узнагароджання з моманту ацэнкі.

Аўтар кнігі звярнуўся ў Нацыянальны музей гісторыі і культуры з просьбай прадставіць яму картатэку кладаў, якія маюцца ў распараджэнні музея, але картатэка прадстаўлена яму не была. Між тым, у музеі захоўваецца значная колькасць /каля сотні/ неапублікаваных кладаў. Музей, як вядома, павінен выконваць ролю нацыянальнага метадычнага музейнага цэнтра, а гэта значыць, не абмяжоўваць доступа спецыялістаў-даследчыкаў да матэр'ялаў.

І. І.Сінчук звярнуўся з шэрагам пытанняў пра клады ў Міністэрства культуры РБ, але адказу на гэтыя пытанні /яны прыведзеныя ў кнізе/ не атрымаў. У сувязі з гэтым можна быць пэўным, што аніводзін спецыяліст-нумізмат у музеях Міністэрства культуры не працуе і кваліфікавана адказаць на пастаўленыя пытанні папросту няма каму.

Незвычайна дрэнна выглядае сітуацыя з вывучанасцю беларускіх кладаў у плане міжнароднай кааперацыі. Апублікаваны інвентары Польшчы, Украіны, Літвы, але няма інвентара кладаў Беларусі.

Не паддаецца лагічнаму тлумачэнню існаванне адначасова двух правадзейных законаў аб узнагароджанні дзяржавай асобы, якая адшукала клад. Згодна з першым з законаў такі чалавек атрымлівае 25 % ад вартасці знойдзенага клада, згодна з другім – 50 % пры іншых роўных умовах. Тэрміны правядзення ацэнкі знойдзенага клада не вызначаны; у сувязі з гэтым узнагароджанне можа затрымлівацца да бясконцасці. Апрача таго, існуюць дзесяткі магчымых сітуацый пры адшуканні клада, якія не прадугледжанны законам вогуле.

Па ініцыятыве аўтара ў 1991 г. Вярхоўны Савет Беларусі запрасіў Расію пра колькасць кладаў, якія з тэрыторыі Беларусі перададзены на захаванне ў Маскву ў агульнае захоўванне кладаў. Паралельна было запрошана Міністэрства унутраных спраў РБ. Міністэрства паведаміла пра 26 кладаў манет. Расія дала звесткі пра тое, што ёй з Беларусі перадана ўсяго два клады. Да таго ж, у 2002 годзе супрацоўнікі унутраных спраў РБ ужо не адшукалі ў сваіх архівах звестак пра перадачу беларускіх кладаў у Расію. Але фотакопіі адказаў 1991 г. існуюць і ў кнізе І. І.Сінчука яны апублікаваны.

Аўтар кнігі прапануе захады, якія ў стане змяніць існуючы парадак рэчаў. У прыватнасці, прапанова такая: калі на працягу вызначанага кароткага часу супрацоўнікамі клад не вызначаны і не апублікаваны ў сучасных электронных сродках інфармацыі (з улікам легенд, метралагічных параметраў, з выявай кожнай манеты), дык клад вызначаецца запрошанымі кантрактнымі спецыялістамі (у тым ліку і замежнымі) і пазней перадаецца з аукцыёна для пакрыцця выдаткаў на яго апісанне.

Клады манет павінны быць выведзены з састава адзінага дзяржаўнага фонда каштоўных металаў і каштоўных камянёў.

Стварыць альтэрнатыўную музеям, выставачным залам сетку сховішчаў старадаўнасцей. Гэтыя сховішчы не мелі б экспазіцый і былі б скіраваныя толькі на захаванне артэфактаў з мэтаю прадстаўлення іх даследчыкам.

Выклікае павагу грамадзянскі пафас кнігі. Назіранні І. І.Сінчука зыходзяць з яго жадання ўнесці ўклад да канструктыўнага развіцця нацыянальнай культуры. Можа быць, кніга І. І.Сінчука не здолее вырашыць усіх праблемаў з кладамі. Але факты, абвешчаныя ў ёй, існуюць. Ігнараванне фактаў, як паказвае вопыт жыцця, - не найлепшы шлях да змянення сітуацыі на лепшае. Чытачам кнігі "Клады Беларуси:законодательство и практика" хацелася б верыць, што працэс выпрацоўкі беларускай ідэалогіі, грамадзянскі клопат аб лёсе нацыянальнай культуры прымусяць грамадства прыглядзецца да сітуацыі з кладамі і зрабіць з яе адпаведныя, каштоўныя для дзяржавы і народа, высновы.

УДК 327.01

***Стралец М.В.***

# АНАТОМІЯ ПЕРАЛОМНАГА ЭТАПА Ў ГІСТОРЫІ ГЕРМАНСКАГА ПЫТАННЯ

## *РЭЦЭНЗІЯ НА ВЫДАННЕ ПЕТЕЛИН Б. В. ГЕРМАНСКАЯ ПОЛИТИКА КАНЦЛЕРА ГЕЛЬМУТА КОЛЯ 1982 – 1990 ГГ.: НАУЧНОЕ ИЗДАНИЕ. – ВОЛОГДА, 2004. – 304 С.*

Доктар гістарычных навук, прафесар Валагодскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта Барыс Валянцінавіч Пяцелін звыш чвэрці стагоддзя актыўна і мэтанакіравана даследуе найноўшую гісторыю Германіі. Рэцэнзуемая манаграфія належыць да несумненных удач навукоўцы. Ужыванне ў найменні рэцэнзіі слова «анатомія» тлумачыцца наступнымі прычынамі.

Па-першае, манаграфія Б. Пяцеліна ў сваёй змястоўнай частцы ўяўляе сабой сістэмную рэканструкцыю ключавога звяна ў гісторыі германскага пытання ў 1982 – 1990 гг. – пазіцыі кіраўніка вышэйшай выканаўчай улады ФРГ.

Па-другое, ніводная публікацыя, прысвечаная германскай палітыцы Г. Коля,не можа параўнацца з працай валагодскага навукоўцы па крыніцазнаўчай базе. «У падрыхтоўцы манаграфіі выкарыставаны архіўныя матэрыялы Фундацый Конрада Адэнауэра (ХДС) і Ханса Зайдэля (ХСС); расійскіх архіваў: АЗП РФ, РДАНГ, РДАСПГ, дакументальныя матэрыялы Гарбачоў – фундацыі, якія адносяцца непасрэдна да германскай палітыцы СССР другой паловы 1980-х гг.»(С. 4). Абсалютная большасць фактаў, якія выкладаюцца прафесарам Б. Пяцеліным, упершыню ўводзіцца ў навуковы абарот. Дарэчы, многія з фактаў такога кшталту ўключаны ў дадаткі, якія размешчаны на старонках 226-274. Гэтыя дадаткі могуць з вялікім поспехам укараняцца ў навучальны працэс у ВНУ і школах.

Па-трэцяе, пастаянна прасочваецца фундаментальна абгрунтаваная аўтарская канцэпцыя, паўсюдна адчуваюцца глыбіня і арыгінальнасць высноў і ацэнак, імкненне даказаць беспадстаўнасць тых стэрэатыпаў, якія склаліся ў гістарычнай навуцы. Паставіўшы сабе на мэце ажыццявіць комплекснае даследаванне германскай палітыкі Г. Коля, навукоўца аднолькава ўдала аналізуе яе арганізацыйна-прававы, канцэптуальны, практычны аспекты.

Пры звароце да першага аспекта аўтар канцэнтруе ўвагу на «трох стаўпах» улады: партыю, як «базіс улады»; фракцыю ў бундэстагу, як «сетку ўлады»; ведамства канцлера, як

«цэнтр улады» (С. 27). Ён грунтоўна раскрывае дачыненне кожнага з гэтых стаўпоў да распрацоўкі і ажыццяўлення германскай палітыкі ў 1982-1990 гг. Пры гэтым Б. Пяцелін робіць прынцыпова новую ацэнку дзейнасці кіраўніка другога ўпраўлення ведамства федэральнага канцлера Хорста Тэльчыка ў дадзеным напрамку. «Па свайму становішчу (міністр замежных спраў ФРГ. – М. С.) Геншэр быў значна вышэй, чым кіраўнік «упраўлення» Тэльчык, але дзеянні апошняга ў правядзенні германскай палітыкі, асабліва ў завяршальнай фазе, былі больш важкімі. Мела значэнне, што погляды Тэльчыка і Коля на змест перспектыў германскай палітыкі, нягледзячы на супраціўленне часткі членаў урада і некаторых дзеячаў у ХДС/ХСС, у той час супадалі»(С. 34). Да выхада ў свет рэцэнзуемай манаграфіі германісты былі аднадушныя ў тым, што Ганс-Дзітрых Геншэр адыграў другую пасля Гельмута Коля ролю ў распрацоўцы і ажыццяўленні германскай палітыкі ў 1982-1990 гг.

Навукоўца прапаноўвае арыгінальны варыянт перыядызацыі германскай палітыкі канцлера Г. Коля, выдзяляючы наступныя яе этапы:

I. «1982-83 гг. – дэманстрацыя гатоўнасці да правядзення абноўленай германскай палітыкі»(С. 17-38);

II. «Аператыўная германская палітыка ў 1983-1986 гг.»(С. 38-68);

III. «Новыя рэальнасці і магчымасці ў германскім пытанні ў 1987-1989 гг.» (С. 69-124);

IV. «Аб’яднанне Германіі ў 1989-1990 гг.» (С. 125-185).

У манаграфіі задаецца ключавое пытанне: «Ці меўся ў ХДС/ХСС план аб’яднання Германіі?» (С. 191)

На наш погляд, аўтар мае рацыю, калі адказвае на дадзенае пытанне: «Размова не ідзе аб дакуменце з назвай «план па аб’яднанню ФРГ і ГДР у 1989-90 гг.» з раскладам усіх дзеянняў, параграфамі, пунктамі і іншым. Такога дакумента няма. Але гэта не значыць, што канцлер Коль займаўся «імправізацыяй» на полі германскай палітыкі, а аб’яднанне аказалася толькі справай выпадку. Па-за ўсялякага сумнення, урад ФРГ, грунт якога складалі ХДС/ХСС, сам канцлер вялі выразную лінію, устраняючы ўсе перашкоды на гэтым шляху. Як прызнаваў пазней Г. Коль, «… немцы мелі магчымасць для аб’яднання толькі на працягу, напэўна, пяцішасці месяцаў. Пасля гэтага яна была б упушчана». У гэтай сітуацыі толькі прадуманыя – плануемыя – дзеянні маглі прынесці поспех. Апублікаваныя дакументы з Ведамства федэральнага канцлера, пераклад якіх у Расіі наўрад ці магчымы ў хуткім часе, пераконваюць у гэтым» (С. 192).

Відавочная навуковая навізна прасочваецца ва ўсебаковым паказе ўліку Г. Колем фактара Хрысціянска-сацыяльнага саюза ў Баварыі ў распрацоўцы германскай палітыкі. Да выхаду рэцэнзуемай працы ў германістыцы абсалютызавалася роля старшыні ХСС Франца Йозефа Штраўса ў фарміраванні канцэпцый сваёй партыі, лічылася, што ў яго не было прынцыповых апанентаў у дадзеным пытанні з ліку аднапартыйцаў. У адрозненні ад падобных сцвярджэнняў, Б. Пяцелін піша: «Патрабаванні Штраўса аб «аднаўленні Германіі ў межах 1937 г.» не заўсёды падзяляліся дэпутатамі зямельнай группы ХСС у бундэстагу, аб чым сведчылі апублікаваныя ў пачатку 1985 г. «меркаванні ХСС па германскай палітыцы», зусім прымальныя для кіраўніцтва ХДС» (С. 188).

Да вартасцяў рэцэнзуемай манаграфіі трэба аднесці і скрупулёзна складзеную храналогію германскай палітыкі 1982-1990 гг.(С. 275-293)

Безумоўна, манаграфію валагодскага навукоўцы з вялікай цікавасцю будуць чытаць студэнты і выкладчыкі ВНУ, магістранты, аспіранты, дактаранты, сталыя даследчыкі. Застаецца толькі пашкадаваць, што ў такой цікавейшай кнізе зусім невялікі наклад: 300 паасобнікаў.

УДК 329(031)

***Стрелец М.В.***

## ОБРАЗЕЦ СИСТЕМНОГО АНАЛИЗА В ИСТОРИЧЕСКИХ ИССЛЕДОВАНИЯХ

***ПАВЛОВ Н.В., НОВИКОВ А.А. ВНЕШНЯЯ ПОЛИТИКА ФРГ ОТ АДЕНАУЭРА ДО ШРЁДЕРА. - М., ЗАО «МОСКОВСКИЕ УЧЕБНИКИ - СИДИПРЕСС», 2005 - 608С.***

Перед каждым молодым человеком, который решает утвердиться на научном поприще, обязательно встаёт следующий вопрос: на кого же надо равняться внутри исследовательского корпуса? Авторы рецензируемой монографии принадлежат к тем маститым учёным, научные труды которых следует оценивать как образцовые. Настоящая оценка относится, прежде всего, к феноменальной способности крупных российских германистов Николая Валентиновича Павлова и Александра Александровича Новикова осуществлять системный анализ на основе гигантского фактологического массива. Важно также иметь в виду, что авторы имеют богатый опыт апробации своих фундаментальных научных обобщений. Доктор исторических наук, профессор Н.В. Павлов активно внедрял их в учебный процесс в период работы в Дипломатической академии МИДа Российской Федерации, Московском лингвистическом университете, а дипломат, кандидат исторических наук А.А. Новиков рассматривает данные обобщения как существенное подспорье, будучи непосредственно задействованным на германском направлении внешней политики РФ.

Исходный пункт системного анализа учёных таков: «Будучи системой, германская внешняя политика включает в себя своеобразные «подсистемы», в основе которых лежат как региональные составляющие (например, «восточная политика», «помощь развитию», «европейская политика» в рамках ЕС), так и функциональные блоки проблем («атлантическая солидарность», контроль над вооружениями, ОБСЕ и т.п.). Причём как внешняя политика ФРГ в целом, так и её каждая подсистема в отдельности имеют свою точку отсчёта, свою относительно самостоятельную историю, эволюцию и, соответственно, периодизацию, что обусловлено особенностями развития, как всей системы, так и её составляющих». (С. 17) Система и подсистемы, о которых идёт речь в цитируемом пассаже, чётко и последовательно прослеживаются авторами от времён первого канцлера ФРГ Аденауэра до момента подписания книги в печать, то есть до 1 февраля 2005 года. Внешняя политика ФРГ определяется, прежде всего, позицией канцлера. Поэтому представляется вполне логичным то, что «структура исследования построена по принципу: от канцлера к канцлеру» (С.21)

«Появлению (рецензируемой. - М.С.) работы способствовал тот факт, что в (постсоветской - М.С.) научной литературе (до неё. - М.С.) не было масштабных комплексных исследований, посвященных всей истории внешней политики ФРГ. (С. 13) Н.В. Павлов и А.А. Новиков восполнили этот пробел, привлекая широкий круг разнообразных источников и наиболее значимые научные труды (С. 593–605). Важно особо отметить, что немалая их часть отсутствует в библиотеках, расположенных на СНГ-овском пространстве. Конечно, при ре-